далей, зліцца з Сожам, упасці ў магутнае Дняпро каля Лоева, дабрацца да самага Чорнага мора...

Глядзіш на гэты цудоўны здымак і адразу прыгадваеш верш свайго вялікага земляка, цудоўнага паэта Аркадзя Куляшова "Мая Бесядзь". У вершы ёсць такая страфа, вядомая ўжо многім чытачам:

*З надзеяй гляджу на крыніцу спатканую,*
*Хачу, каб яна разлілася ракой.*
*Не Волгай магутнай,*
*Не нават Камаю,*
*Хоць Бесяддзю, што на радзіме маёй.*

змешчаны ў франтавой газеце "На разгромы ворага" якраз у тыя дні. Пімен Панчанка разам з іншымі беларускімі пісьменнікамі ваяваў на Бранскім фронце. І калі ўжо нашы войскі падыходзілі да тэрыторыі Беларусі, фарсіравалі Бесядзь, Сож, Дняпро, ён звярнуўся на роднай мове да ўсіх воінаў фронта з такімі радкамі:

*Не знаю – хто ты – баявы уралец,*
*Ці душы каранасты сібірак, –*
*Падправіўшы спарней паходны ранец,*
*Прайшоў ты першы па маіх барах.*

І сапраўды, названыя вышэй воіны і многія іншыя, якія ваявалі на сулогіі і аховы прыроды, доктара біялагічных навук, прафесара Прохара Іванавіча Жукава, акадэміка Беларускай акадэміі навук Міхаіла Піліпавіча Грышчанку, інжынера-будаўніка Міхаіла Іванавіча Дзекаруна і многіх іншых.

Але і тут на дапамогу зноў прыходзяць паэзія і мастацкая проза. У кнізе вельмі добра, з вялікай павагай і, можна сказаць, з любоўю прадстаўлена літаратурная Хоцімшчына. На працягу ўсёй кнігі сустракаюцца імёны, прозвішчы пісьменнікаў, якія нарадзіліся, працавалі, а некаторыя і зараз працуюць, у самім Хоцімскім раёне. Некаторых з іх ужо няма сярод нас, але яны жывуць у прымыкаючым да самога Хоцімска. І хоць ён потым жыў і працаваў у іншых раёнах Беларусі і ў самой сталіцы, ён ніколі не забываў пра сваю малую радзіму.

Найбольш яркім і ўсім вядомым, безумоўна, прадстаўніком нашай сучаснасці з'яўляецца народны паэт Беларусі Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў. Хоць ён нарадзіўся ў мястэчку Саматэвічы, што непадалёк ад Хоцімска, у суседнім Касцюковіцкім раёне, тут на Хоцімшчыне, у вёсках Альшоў, Елавец і ў самім гарадскім пасёлку, ён жыў разам з бацькамі, ўсёй сям'ёй доўгія гады і да вайны, і пасля яе. Тут нарадзіліся ў паэта многія выдатныя вершы і валі над стварэннем і выпускам у свет гэтай цудоўна складзенай і аформленай па-мастацку кнігі памяці. У ёй змешчаны і ўрыўкі з маёй паэмы "Дар Князёўны", якая прысвечана тэме ўзнікнення на старажытнай Беларускай зямлі мястэчка Хоцімск. Назва яе ўпамінаецца ў летапісу яшчэ з 1430 года.

Вось так мы з табой, дарагі чытач, прайшліся па старых і новых сцежках аднаго раёна, які знаходзіцца на ўсходзе Беларусі сярод чароўных, прыгожых прастораў нашай роднай і мілай Бацькаўшчыны.

**Пятро ПРЫХОДЗЬКА**

**Прыходзька, П. Памяць у сэрцы народа** : [ліст ад паэта-земляка] / Пятро Прыходзька // Шлях Кастрычніка. — 2004. — 30 красавіка. — С. 2.